ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№15(1048) | ЧАЦВЕР, 9 кастрычніка 2003 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ВЫСОКАЕ ПРЫЗНАЧЭННЕ НАСТАЎНІКА

Сярод усіх каштоўнасцей свету няма нічога больш важнага, чым веды. Яны – заўсёды з чалавекам, іх не абясцэньвае ніякі крызіс, не знішчыць ніякая інфляцыя. Іх мы атрымліваем дзякуючы настаўніку. Таму не толькі ў першую нядзелю кастрычніка, калі адзначаецца яго прафесійнае свята, а штодзённа нам неабходна выказваць удзячнасць педагогам за іх самаадданую працу, захапляцца іх духоўным падзвіжніцтвам.

Напярэдадні Дня настаўніка жаданымі гасцямі студэнтаў біяфака сталі яго выпускнікі – дырэктар школы-ліцэя №8 г. Гомеля Т.І. Жадзько-Кліменка і настаўнік хіміі абласнога ліцэя П.В. Уласаў.

Іх шлях да дзіцячых сэрцаў пачынаўся з настаўніцкай працы ў глыбінцы, у вясковых школах Гомельшчыны. І вось ужо звыш чвэрці стагоддзя яны "сеюць разумнае, добрае, вечнае", сталі прызнанымі педагогамі, набылі каштоўны вопыт у працы. Ім яны дзяліліся ў час сустрэчы з тымі, хто сёння вучыцца ў студэнцкай аўдыторыі, а заўтра прыйдзе ў школьны клас.

Настаўніку трэба ісці да дзяцей з чыстай душой і сумленнем і вучыцца самому ўсё жыццё – такі наказ педагогі сённяшняга дня далі сваім будучым калегам і паслядоўнікам.

## САГРАВАЦЬ УВАГАЙ І ЦЯПЛОМ

У гонар Дня пажылых людзей кіраўніцтва ГДУ, прафкам, Савет ветэранаў, Савет жанчын арганізавалі сустрэчу з групай былых выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашай ВНУ, якія цяпер знаходзяцца на заслужаным адпачынку. Іх запрасілі, каб выказаць цёплыя словы падзякі за шматгадовую плённую працу на карысць універсітэта, пажадаць моцнага здароўя, бадзёрасці, аптымізму яшчэ на доўгія гады.

Ад імя кіраўніцтва ганаровых гасцей сардэчна і шчыра вітаў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С.Ф. Каморнікаў. Ён расказаў ветэранам працы, многія гады жыцця якіх аддадзены станаўленню і развіццю нашай навучальнай установы, аб сённяшнім дні ГДУ, пашырэнні яго вучэбнага і навуковага патэнцыялу, адзначыўшы пры гэтым, што гэта стала магчымым таксама дзякуючы трывалай базе, закладзенай талентам і энергіяй іх – прадстаўнікоў старэйшага пакалення. Аб гэтым у ГДУ заўсёды будуць памятаць з удзячнасцю. Сяргей Фёдаравіч уручыў ім канверты з матэрыяльнай дапамогай.

## Віншуем!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі і студэнты эканамічнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры эканамічных тэорый* ***САРВІРАВА Барыса Уладзіміравіча*** *з прысуджэннем яму прэзідыумам ВАКа Расіі вучонай ступені доктара эканамічных навук.*

***

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць дацэнта кафедры беларускай літаратуры* ***НОВАК Валянціну Станіславаўну*** *з прысуджэннем ёй прэзідыумам ВАКа Рэспублікі Беларусь вучонай ступені доктара філалагічных навук.*

На Савеце універсітэта

## ЮБІЛЯРАМ – ГОНАР І ПАВАГА

Чарговае пасяджэнне Савета, якое адбылося ў апошні чацвер верасня, пачалося з урачыстага ўшанавання юбіляраў: споўнілася 65 год з дня нараджэння старшыні прафкама Г.І. Варатніцкага і 50 – загадчыка кафедры беларускай літаратуры, д.ф.н., прафесара І.Ф. Штэйнера. У калектыве універсітэта – гэта вельмі паважаныя людзі, якіх цэняць не толькі за дзелавыя, але і чалавечыя якасці.

Цяжка нават уявіць жыццё нашай ВНУ без актыўнага ўдзелу ў ім Георгія Іванавіча, які ўзначальвае прафсаюзны камітэт на працягу звыш 10 гадоў. Ён высокапрафесійна вырашае пытанні і праблемы, што паўстаюць у дзейнасці універсітэта, прафсаюзнай арганізацыі. З нашым універсітэтам звязаны многія гады яго жыццёвай біяграфіі. Яго цэняць за адказны і сур'ёзны падыход да сваёй справы, настойлівасць у вырашэнні надзённых пытанняў, строгасць і патрабавальнасць, як да сябе, так і да падначаленых, а таксама за чуласць і добразычлівасць: у прафкаме ГДУ заўсёды дапамогуць і прафесару, і лабаранту, усім, хто ідзе сюды са сваёй радасцю і горам, за падтрымкай і добрай парадай.



Іван Фёдаравіч Штэйнер – навуковец, выкладчык, кіраўнік, які вельмі плённа працуе на ніве беларускага літаратуразнаўства, фальклору, даследавання духоўнай культуры славянскіх народаў. За свае навуковыя, творчыя здабыткі да знамянальнай у сваім жыцці падзеі ён удастоены ганаровага знака "Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь".

Рэктар прафесар М.В. Селькін цёпла і шчыра павіншаваў юбіляраў, выказаў вялікую падзяку за іх адданасць справе, якой яны служаць, пажадаў далейшых поспехаў у працы, здароўя, асабістага шчасця, дабрабыту, уручыў прывітальныя адрасы, Ганаровыя граматы універсітэта, кветкі.

***

На парадак дня Савета былі вынесены пытанні, звязаныя з вучэбнай, навуковай, ідэалагічнай і выхаваўчай работай у ГДУ.

Члены Савета абмеркавалі і падтрымалі кандыдатуры, вылучаныя для абрання акадэмікамі НАН Беларусі.

Па інфармацыі начальніка вучэбнага аддзела Н.І. Папковай прызначаны імянныя стыпендыі і стыпендыі Савета ВНУ студэнтам, якія добра вучацца, актыўна займаюцца навукова-даследчай работай, прымаюць удзел у грамадскім жыцці ГДУ.

Зацверджаны Палажэнне аб атэстацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу, з якім членаў Савета азнаёміў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С.Ф. Каморнікаў, а таксама Палажэнне аб інфармацыйна-аналітычнай службе ГДУ. Яго пракаменціраваў прарэктар па выхаваўчай рабоце А.В. Лысянкоў.

Па інфармацыі начальніка НДС В.Р. Сафонава ўнесены змены і дапаўненні да плана навукова-даследчай работы на трэці квартал г.г.

Рэкамендавана да апублікавання манаграфія дацэнта кафедры беларускай мовы В.А. Ляшчынскай "Слова аб паэзіі Я.Купалы".

Зацверджаны план работы Савета універсітэта на бягучы навучальны год, унесены змены ў Статут ГДУ.

**На здымку: рэктар М.В. Селькін віншуе юбіляра Г.І. Варатніцкага.**

**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

Да 60-годдзя вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

## РАДЗІМЫ СЛАЎНЫ СЫН

**У вучэбна-культурным цэнтры "Юбілейны" нашага універсітэта праведзена навукова-практычная канферэнцыя "Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі – таленавіты палкаводзец, маршал Савецкага Саюза". Яна прысвячалася 60-годдзю вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яе арганізавалі кіраўніцтва ГДУ,пярвічная арганізацыя Беларускага Рэспубліканскага саюза моладзі, абласны Савет ветэранаў.**

**Удзел у гэтым маштабным мерапрыемтсве прынялі шматлікія ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, жыхары г. Гомеля, выкладчыкі, студэнты ГДУ, школьнікі.**

Уступным словам канферэнцыю адкрыў і вёў рэктар ГДУ прафесар М.В. Селькін. З дакладам "К.К. Ракасоўскі – выдатны военачальнік, двойчы Герой Савецкага Саюза, Ганаровы грамадзянін г. Гомеля" выступіў ветэран вайны і працы, заслужаны работнік культуры БССР Ф.П. Стэльмашок.

Сярод выступаючых былі вядомыя на Гомельшчыне сваімі ратнымі подзвігамі і працоўнымі дасягненнямі ветэраны вайны і працы К.М. Карасёў, Ф.С. Міхалёў, С.В. Асіпкова і інш. Яны падрыхтавалі да канферэнцыі паведамленні аб гераічным жыцці, слаўных баявых аперацыях савецкага маршала. Дзякуючы гэтаму таленавітаму палкаводцу 26 лістапада 1943 г. савецкія войскі ў складзе 1-га і 2-га Беларускіх франтоў поўнасцю вызвалілі горад Гомель ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Усё сваё жыццё К.К. Ракасоўскі прысвяціў людзям, змаганню за свабоду і шчасце савецкага народа. Арганізатар і ўдзельнік шматлікіх ваенных аперацый, Канстанцін Канстанцінавіч быў узнагароджаны 43-ма ордэнамі і медалямі, сярод якіх – узнагароды і замежных дзяржаў, яму двойчы прысвойвалася ганаровае званне Героя Савецкага Саюза.



На канферэнцыі ўзгадваўся вельмі цікавы эпізод, звязаны з нашай ВНУ – тагачасным педагагічным інстытутам імя В.П. Чкалава: маршал К.К. Ракасоўскі арганізаваў дастаўку матэрыяльнай дапамогі, неабходнага інвентару для аднаўлення гаспадаркі, на патрэбы студэнцкага інтэрната па вул. Песіна.

У выступленнях удзельнікаў канферэнцыі прагучала галоўная думка: трэба берагчы мір, памятаць пра подзвіг, аддаючы даніну павагі змагарам за нашу свабоду і шчасце.

**М. СЕВЕР'ЯНАВА, студэнтка 4 курса філфака.**

**На здымку: кветкі ад маладога пакалення – ветэрану вайны і працы, заслужанаму работніку культуры БССР Ф.С. Міхалёву.**

**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

Сувязь пакаленняў

## "МЫ МІР АДСТАЯЛІ, ВАМ У ГЭТЫМ МІРЫ ЖЫЦЬ"

Такой тэме прысвячалася сустрэча ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўнікоў старэйшага пакалення, якое зведала яе жахі, з выкладчыкамі, студэнцкай моладдзю нашага універсітэта. Яна праходзіла ў актавай зале і стала своеасаблівай данінай павагі тым, хто адстаяў у суровыя 40-я наш сённяшні мірны шчаслівы дзень, заклікала сённяшнюю моладзь рабіць усё для таго, каб ніколі зноў на планеце не разгаралася полымя ваенных канфліктаў.

Перад студэнцтвам, якое ведае аб вайне толькі з расказаў жывых яе сведкаў – ветэранаў, а таксама з кінафільмаў і кніг, стаіць адказная задача: працягваць эстафету старэйшага пакалення ў ваенна-патрыятычным выхаванні сённяшняй моладзі. Мацаваць мір ім неабходна і сваёй выдатнай вучобай, працалюбствам, павагай да подзвігаў сваіх дзядоў – такім быў лейтматыў сустрэчы, якую адкрыў і вёў старшыня Гомельскага абласнога аддзялення фонду міру Ц.І. Глушакоў.



Перад моладдзю выступілі ст. навуковы супрацоўнік абласнога краязнаўчага музея, кандыдат гістарычных навук Э.А. Чартко, які расказаў аб міралюбівай палітыцы былога СССР і Рэспублікі Беларусь, генерал-маёр у адстаўцы В.С. Шукшын, 37 гадоў жыцця якога ў складзе ваеннай авіяцыі аддадзены абароне ў мірны час рубяжоў нашай краіны. Прыкладам самаадданага служэння высакароднай справе выхавання патрыятызму стала выступленне былога юнага партызана Гомельшчыны, кандыдата педагагічных навук, аўтара кнігі аб героях Савецкага Саюза, палкоўніка ў адстаўцы С.Ф. Шакарава.

Пранікнёнымі і хвалюючымі былі расказы-споведзі аб дзяцінстве і юнацтве, абпаленымі вайной, былой блакадніцы Ленінграда, медсястры Н.І. Карась і вязня фашысцкіх канцлагераў, навуковага супрацоўніка музея А.С. Міхайлавай.

Няўмольны час не павінен сціраць у памяці сённяшняга пакалення вялікі подзвіг нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэтая думка прагучала ў выступленнях прадстаўнікоў моладзі – пяцікурсніка геолага-геаграфічнага факультэта Дзмітрыя Сярых, вучня СШ №19 г.Гомеля Алега Казакова і ст. лейтэнанта в/ч № 5525 Сяргея Саладухіна.

**На здымку: госці універсітэта-ветэраны са студэнцкай моладдзю.**

**Фота У ЧЫСЦІКА.**

## ПОВЫСИЛАСЬ ЗАРПЛАТА

С 1 сентября 2003 года повышены размеры тарифной ставки первого разряда с 28 тысяч рублей до 33 тысяч рублей и базовой величины с 14 тысяч рублей до 16 тысяч 500 рублей. Соответствующее постановление приняло правительство во исполнение поручения Президента Республики Беларусь. Принятие данного решения является очередной мерой по поэтапному повышению размера заработной платы и социальных выплат гражданам страны. Оно направлено на выполнение в 2003 году прогнозного показателя по росту реальной заработной платы работников бюджетной сферы.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую працу, добрасумленныя адносіны да выканання службовых абавязкаў камендант вучэбнага корпуса №4 **МАРЧАНКА Таццяна Іванаўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.

# РЕГИОНАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ДОЛЖНЫ РЕШАТЬ ПЕРИФЕРИЙНЫЕ ВУЗЫ

В силу объективных и субъективных факторов исторически сложилось так, что периферийные вузы Беларуси отстают от столичных в материально-техническом обеспечении, кадровом потенциале и, как следствие, в развитии науки и образования в некоторых направлениях. Однако необходимо, чтобы качество образования было одинаковым независимо от расположения учебного заведения.

Как известно, качество университетского образования определяется уровнем университетской науки. В свою очередь последний зависит от развития инфраструктуры научной и инновационной деятельности. Отсюда вытекает генеральное направление для государственных органов управления наукой – целенаправленное содействие подъему уровня науки во всех периферийных вузах и включению их научного потенциала в решение приоритетных для страны задач. Организационно это можно ускорить путем создания на базе кафедр и лабораторий вузов научных подразделений академического и отраслевого типа со статусом двойного подчинения, а также инновационных структур – как государственных, так и частных. В этом случае периферийные вузы реально могут существенно влиять на политику государства в области науки и образования как на общенациональном, так и на региональном уровне.

Что касается общенационального и регионального уровня в науке и образовании, то различие их ни в коем случае не должно лежать в области качества – оно допустимо лишь в содержательных аспектах.

К чисто региональным мы относим такие проблемы, которые вытекают из особенностей и своеобразия региона. Здесь надо учитывать природную среду, экономику и производство, экологию, историю, культуру, здоровье людей, воспроизводство кадров специалистов различного уровня, демографические проблемы.

Подход к разработке региональных проблем может быть только комплексный, т.е. на основе целевых региональных программ с участием всех научных организаций и вузов региона независимо от их ведомственной подчиненности. Финансирование таких программ должно осуществляться как за счет средств республиканского бюджета, так и местного, а также средств отраслевых министерств, предприятий и фирм.

Экспертизу региональных программ целесообразно проводить на уровне научно-технического совета облисполкома. Государственной экспертизе следует подвергать лишь те части, для финансирования которых испрашиваются средства из госбюджета.

Периферийные классические университеты, являющиеся научными и культурными центрами определенных регионов, в своей деятельности должны ориентироваться не только на общенациональные, но и на региональные интересы. На последние, может быть, в большей степени.

Они вполне в состоянии вести программы, связанные с историей, культурой, социальным и экономическим развитием, образованием, подготовкой кадров высшей квалификации, экологией края.

Например, Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины решает такие региональные проблемы, как особенности геологического строения земной коры, методы защиты артезианских запасов питьевой воды от источников поверхностного загрязнения; комплекс экологических проблем, связанных с ликвидацией последствий Чернобыльской аварии; проблемы сохранения и рационального использования растительного и животного мира региона; разработка и внедрение в практику методик оздоровления населения средствами физической культуры; изучение истории и культуры края; экономическое развитие эколого-дестабилизированного региона, каковым является Гомельщина. Перечисленные проблемы находят отражение в планах научно-исследовательских работ университета и двух его научных подразделений: института экологии и института истории и культуры восточнославянских народов.

ГГУ им. Ф. Скорины, как ведущий вуз Гомельщины, выступил инициатором разработки Программы развития высшего образования в регионе на 2001-2005 г.г., предусматривающий меры по внедрению в учебный процесс новых образовательных технологий, реализующих исследовательский принцип обучения.

Университет играет в регионе роль центра подготовки научных кадров высшей квалификации для научных организаций и вузов Гомельщины. Подготовке региональных кадров высшей квалификации в немалой степени способствует созданные при ГГУ им. Ф. Скорины 6 советов по защите диссертаций по 8 специальностям, в том числе 2 региональных по специальностям экология (биологические науки), политическая экономия, экономика и управление народным хозяйством (экономические науки).

Таким образом, региональные проблемы в области науки и образования могут и должны решать периферийные классические университеты, привлекая для этих целей профильные университеты. Для этого необходимы понимание и воля местных органов власти и государственных структур.

**М.В. СЕЛЬКИН,**
**ректор Гомельского госуниверситета им. Ф. Скорины, доктор физико-математических наук, профессор, член Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь.**

**(«Звязда», 16 сентября 2003 г.)**

## НА ТРАДЫЦЫЙНЫХ ЧЫТАННЯХ

18-19 верасня ў г.Рэчыцы адбыліся Чацвёртыя міжнародныя навуковыя Доўнараўскія чытанні. Іх арганізатарамі з'яўляліся Рэчыцкі раённы выканаўчы камітэт і наш універсітэт.

Праграма мерапрыемства прадугледжвала абмеркаванне старонак жыцця і праблем навуковай спадчыны вядомага гісторыка Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага, а таксама новых здабыткаў у вывучэнні гісторыі і культуры Рэчыцкага рэгёна.

А напярэдадні Гомельская гарадская бібліятэка імя Герцэна ладзіла прэзентацыю кнігі вучонага "История Белоруссии", якая пры яго жыцці так і не ўбачыла свет. Яе аўтэнтычны тэкст выйшаў у выдавецтве "Беларусь" у 2003 г.

У чытаннях прынялі ўдзел больш 60 даследчыкаў, сярод іх – 17 дактароў і 23 кандыдаты навук з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы і Ізраіля.

Адкрылі чытанні нам. старшыні Рэчыцкага раённага выканаўчага камітэта В.Г. Атаманчук і д.т.н., прафесар, прарэктар па навуковай рабоце ГДУ Д.Р. Лін. На пленарным пасяджэнні былі заслуханы 4 навуковыя даклады аб дзейнасці М.В. Доўнар-Запольскага, а ў дзвюх секцыях – "М.В. Доўнар-Запольскі: жыццё і навуковая спадчына" і "Рэчыца ў часе і прасторы: 790 год з дня заснавання горада" – звыш 30-ці. Вучоныя і студэнты нашага універсітэта прадставілі звыш 10-ці цікавых даследаванняў.

Удзельнікі чытанняў наведалі г. Лоеў, які рыхтуецца да юбілею дзвюх вялікіх ваенных падзей – Лоеўскай бітвы паміж Б.Хмяльніцкім і Я.Радзівілам у 1654г. і вызвалення Лоева ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943 г.

Прафсаюзнае жыццё

## З УЛІКАМ АКТУАЛЬНЫХ ЗАДАЧ

**На базе Кіеўскага нацыянальнага універсітэта імя Т. Шаўчэнкі праведзены чарговы XV з'езд Еўразійскай асацыяцыі прафсаюзных арганізацый універсітэтаў (ЕАПАУ), у якую ўваходзіць і ГДУ імя Ф. Скарыны. Адно з пасяджэнняў з'езда праходзіла ў г. Сімферопалі, у Таўрычаскім нацыянальным універсітэце.**

Асацыяцыя ўтворана ў 1987 годзе, аб'ядноўвае прафсаюзныя арганізацыі 57 класічных універсітэтаў краін СНД. Яе ўзначальвае старшыня прафкама МДУ імя М.В.Ламаносава І.Б.Катлабоўскі.

Жыццё паказала, што, нягледзячы на пэўныя адрозненні, універсітэты – найбольш блізкая між сабой катэгорыя вышэйшых навучальных устаноў. Яны, як правіла, з'яўляюцца цэнтрамі прафсаюзнага руху ў рэгіёнах, абмен вопытам паміж імі садзейнічае распаўсюджванню перадавых метадаў прафсаюзнай работы. Універсітэты ўсталявалі трывалыя кантакты не толькі ў яе рамках, але і наладзілі ўзаемадапамогу ў вырашэнні навуковых і вучэбных праблем, культурныя сувязі. Дзейнасць асацыяцыі аказвае рэальную сацыяльную дапамогу калектывам і кіраўніцтву універсітэтаў.

На апошнім, вераснёўскім з'ездзе ЕАПАУ яго дэлегаты – старшыні прафкамаў з удзелам кіраўнікоў прафсаюзаў Украіны і Крыма абмеркавалі практыку заключэння і прымянення Калектыўных дагавораў, заканадаўства аб вышэйшай адукацыі, напрамкі рэфармавання сістэмы адукацыі ў краінах СНД і ролю прафсаюзаў у гэтым працэсе.

У рабоце з'езда прынялі ўдзел старшыня прафкама ГДУ Г.І. Варатніцкі і старшыня прафкама студэнтаў Н.І. Колтышава, якая выступіла з дакладам аб сістэме адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

## АБ АТЭСТАЦЫІ ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА САСТАВУ

Яна праходзіць у нашым універсітэце па складзенаму графіку згодна Палажэння, зацверджанага рашэннем Савета універсітэта, і завершыцца да 1-га лістапада гг.

Атэстацыя праводзіцца з мэтай ацэнкі якасці вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы выкладчыкаў універсітэта, а таксама іх прафесійнай прыгоднасці з улікам патрабаванняў, якія выцякаюць з задач рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі.

Атэстацыі падлягае ўвесь прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта, акрамя выкладчыкаў, якія выбіраюцца па конкурсу ў год атэстацыі, выкладчыкаў, ужо абраных у папярэдні атэстацыі вучэбны год; а таксама выкладчыкаў, якія працуюць ва універсітэце меней за адзін год; цяжарных жанчын і жанчын, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў.

З улікам абмеркавання вынікаў дзейнасці атэстуемага камісія можа даваць рэкамендацыі для выбару па конкурсу, змянення займаемай пасады, устанаўлення павышаючых каэфіцыентаў да службовых акладаў, а таксама павышэння кваліфікацыі і інш.

З ІІ абласной навуковай канферэнцыі

## ДАСЛЕДУЕ МОЛАДЗЬ

**На базе нашага універсітэта праведзена ІІ абласная навуковая канферэнцыя студэнцкай і навучэнцкай моладзі Гомельскай вобласці па грамадскіх навуках "Беларусь у сучасным свеце". Яе арганізатарамі з'яўляліся аблвыканкам, абласны Савет дэпутатаў, абласная арганізацыя таварыства "Веды" і ГДУ. Канферэнцыя праводзілася ў рамках Рэспубліканскага конкурсу спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Мэта конкурсу – стымуляванне пошукава-даследчай дзейнасці навучэнцаў і студэнтаў устаноў адукацыі, выяўленне таленавітай моладзі. Канферэнцыя падвяла вынікі другога тура ІІІ Рэспубліканскага конкурсу. Першы прайшоў у красавіку-маі г.г. ва ўстановах адукацыі, і ў ім прынялі ўдзел звыш 600 студэнтаў ВНУ і тэхнікумаў, навучэнцаў прафтэхвучылішчаў, школ, ліцэяў і гімназій вобласці.**

**Аргкамітэтам канферэнцыі для ўдзелу ў другім (абласным) туры было адабрана 107 работ. Іх прадставілі студэнты 6 ВНУ, навучэнцы 12 тэхнікумаў, 1 ПТВ і вучні 22 школ Гомельшчыны.**

Адкрываючы работу канферэнцыі, рэктар ГДУ д.ф-м.н., прафесар М.В. Селькін адзначыў узрастаючую з кожным годам цікавасць моладзі да навуковых даследаванняў у галіне грамадскіх навук, дзе можна найбольш поўна рэалізаваць свой патэнцыял, а значыць, актыўна ўдзельнічаць у стварэнні будучыні сваёй краіны.

На пленарным пасяджэнні былі заслуханы даклады загадчыка аддзела па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама В.А. Санчука "Маладзёжная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь" і загадчыка кафедры палітычнай сацыялогіі ГДУ кандыдата сацыялагічных навук А.Я. Рычкова "Ідэалогія беларускай дзяржавы і моладзь". У іх прыводзіліся цікавыя лічбы і фактычны матэрыял аб дзейнасці грамадскіх маладзёжных фарміраванняў у нашай краіне, вобласці, падкрэслівалася ўзрастаючая роля ідэалогіі як кансалідуючай ідэі і актыўнасць моладзі ў жыцці беларускай дзяржавы.

На канферэнцыі працавалі 6 секцый: "Гісторыя Беларусі і краязнаўства", "Філасофія", "Паліталогія і сацыялогія", "Эканамічныя тэорыі", "Права", "Культуралогія і рэлігіязнаўства".

Сёлета значна пашырылася геаграфія конкурсу. Калі ў рабоце І абласной канферэнцыі былі прадстаўлены пераважна даследаванні гамяльчан, то цяпер у ім прымалі ўдзел студэнты і навучэнцы з Мазыра, Жлобіна, Светлагорска, Добруша, Рэчыцы, Жыткавіч, Буда-Кашалёва, Хойнік, Лоева.

Усе работы ўдзельнікаў канферэнцыі прааналізавалі эксперты (кіраўнікі секцый) з ліку лепшых вучоных і выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін. Асноўныя крытэрыі, якія прад'яўляліся да творчых работ маладых даследчыкаў, – актуальнасць гістарычных, сацыяльна-эканамічных, філасофскіх, палітыка-прававых праблем, асветленых у адпаведнасці з тэмай конкурсу «Беларусь у сучасным свеце», самастойнасць і індывідуальны характар выканання. Аргкамітэт вызначыў звыш 40 лепшых работ студэнтаў і навучэнцаў, якія адзначаны спецыяльнымі дыпломамі. Сярод пераможцаў – 11 студэнтаў нашага універсітэта. Лепшыя работы адпраўлены на трэці тур Рэспубліканскага конкурсу.

– Можна канстатаваць, – зазначае старшыня аргкамітэта канферэнцыі прарэктар па вучэбнай рабоце д.ф-м.н., прафесар С.Ф. Камornікаў, – што конкурс стаў добрай школай для маладых людзей, якія цікавяцца грамадскімі навукамі. Шэраг пераможцаў папярэдняга, ІІ Рэспубліканскага конкурсу, пасля заканчэння ВНУ паступілі ў аспірантуру, вырашылі звязаць сваё жыццё з навукай. Атрыманы вопыт многія будуць выкарыстоўваць у далейшай рабоце ў калектывах у сферы вытворчасці, адукацыі, кіравання.

Многія работы ІІ Рэспубліканскага конкурсу, на думку экспертаў, выкананы на высокім навуковым узроўні і атрымалі дастойную ацэнку на розных конкурсах. У прыватнасці, даследаванні студэнтаў нашага універсітэта Я. Западнюка і С. Каморнікава ў галіне эканомікі ўдастоены прэмій і медалёў 14-га конкурсу Расійскай акадэміі навук для маладых вучоных СНД.

На базе Гомельскага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі выдадзены зборнік матэрыялаў праведзенай канферэнцыі. Першая публікацыя для большасці яе ўдзельнікаў стане добрым стымулам да далейшых навуковых даследаванняў.



**На здымку: студэнт 2-га курса фізічнага факультэта Яўген Цялегін. Яго работа "Рэспубліка Беларусь у Інтэрнеце: па матэрыялах сайтаў, якія утрымліваюць інфармацыю аб Рэспубліцы Беларусь" (навуковы кіраўнік – к.г.н., дацэнт І.Ф. Эсмантовіч) удастоена дыплома пераможцы конкурсу ў секцыі "Паліталогія і сацыялогія".**
**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

## НАМ БЛАГОДАРНЫ

**Прекрасно организованный праздник города, который состоялся в г. Гомеле 13 сентября, надолго запомнится его многочисленным участникам, жителям нашего областного центра, гостям.**

**Немало творческих сил и организаторских способностей вложил в проведение этого красочного действия коллектив нашего университета. И это по достоинству оценено, о чем свидетельствуют благодарственные письма, пришедшие в ГГУ на имя ректора профессора М.В. Селькина от первого заместителя председателя горисполкома Н.Д. Усова и главы администрации Центрального района И.А. Бородинчика:**

Гомельский городской исполнительный комитет выражает благодарность Вам, а также проректору по воспитательной работе Лысенкову Александру Витальевичу, секретарю первичной организации ОО «Белорусский республиканский союз молодежи» Казакову Игорю и всем членам оперативного молодежного отряда дружинников за оказанную помощь в подготовке и проведении праздника города и международного турнира по бально-спортивным танцам.

Благодарим за сотрудничество!

***

Позвольте от имени всех жителей Центрального района выразить Вам и коллективу возглавляемого Вами учреждения искреннюю благодарность за работу по подготовке и проведению Дня города Гомеля 13 сентября 2003 года. Благодаря всем вам этот праздник был проведен на самом высоком уровне и получил достойную оценку горожан и многочисленных гостей города.

Также была высоко оценена ваша творческая работа по оформлению театрализованной праздничной колонны.

Сустрэча з кампетэнтнай асобай

# БУДЗЕ І ПРАЦА, І ЖЫЛЛЁ

Праблему "голаду" на кадры ў лясной галіне Гомельшчыны заклікана зняць адкрытая з бягучага навучальнага года ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны спецыяльнасць "Лясная гаспадарка". На першы курс па дзённай форме навучання прынята 32 чалавекі: 25 – на бюджэтнай аснове, 7 – на платнай, 44 – на завочны факультэт.

Зразумела, у сённяшніх студэнтаў узнікае нямала пытанняў, звязаных з іх будучай прафесійнай дзейнасцю. Адказаць на іх кіраўніцтва біялагічнага факультэта, на якім пачалася падрыхтоўка інжынераў лясной гаспадаркі, запрасіла генеральнага дырэктара Гомельскага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання М.П. Супруна. У студэнцкай аўдыторыі адбылася яго прадметная, зацікаўленая размова са сваімі будучымі калегамі.

Міхаіл Пятровіч падрабязна ахарактарызаваў сённяшняе становішча спраў у лясгасах нашай вобласці, у якіх з-за недахопу кваліфікаваных кадраў працуюць людзі, па сваёй адукацыі вельмі далёкія ад лясной гаспадаркі – аграншчыкі алмазаў, медыкі і г.д. Прычына ў тым, што далёка не ўсе выпускнікі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта, які дагэтуль адзіны ў рэспубліцы рыхтаваў лесаводаў, прыязджалі па накіраваннях працаваць на Гомельшчыну з яе постчарнобыльскімі праблемамі.

Праца ў лесе, як падкрэсліў М.В. Супрун, – не суцэльная рамантыка, замілаванне ў любую пару года прыгажосцю нашага зялёнага сябра. Гэта нястомны клопат аб ім, пачынаючы са збору жалудоў, шышак, насення, якія дадуць потым дружныя ўсходы ў гадавальніках, а праз дзесяткі гадоў стануць "спелым" лесам... Гэта і лесаўстройства па плану на участках, наладжванне ў лесе зон адпачынку, нарыхтоўка драбнатаварнай драўніны, а таксама лясных дароў – лекавых раслін, ягад, грыбоў, аказванне дапамогі сельскай гаспадарцы, пчалярства, конегадоўля і інш.

Многія з сённяшніх студэнтаў-завочнікаў, якія прыйшлі вучыцца ва універсітэт па накіраваннях, ведаюць гэта не па словах, а з асабістай практыкі.

На сустрэчы былі закрануты таксама тэмы аплаты працы, забяспечанасці будучых маладых спецыялістаў жыллём. На гэтыя і іншыя пытанні, зададзеныя выкладчыкамі біяфака і студэнтамі, былі атрыманы вычарпальныя адказы.

**(Наш кар.)**



**На здымку: перад студэнтамі спецыяльнасці "Лясная гаспадарка" выступае генеральны дырэктар Гомельскага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання М.В. Супрун.**

**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

Памяць

# ЖЫЎ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

**26 верасня на філалагічным факультэце прайшлі навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці былога прарэктара ГДУ па вучэбнай і выхаваўчай рабоце Мікалая Мікалаевіча Воінава. З дня яго нараджэння споўнілася 60 год, а з дня смерці – 3 гады.**

Пачаўся гэты самотны дзень з паездкі на могілкі, пасля вяртання з якіх адбылося пленарнае пасяджэнне, якое вяла загадчык кафедры рускай літаратуры дацэнт Л.Л. Ермакова. На ім прысутнічалі родныя, калегі, сябры М.М. Воінава, а таксама студэнты філалагічнага факультэта.

Хвілінай маўчання ўшанавалі яго памяць, а потым узгадваліся самыя адметныя і цікавыя факты біяграфіі Мікалая Мікалаевіча: ад вучобы ў Гомельскім педінстытуце імя В.П.Чкалава, які ён закончыў у 1965 годзе, да працы ў ГДУ – спачатку прарэктарам па завочнаму навучанню, потым – па вучэбнай і выхаваўчай рабоце.

М.М. Воінаў быў адданы сваёй справе, прысвяціў ёй усё сваё жыццё. Аб яго працы, характары, чалавечых якасцях расказвалі тыя, хто прыйшоў на сустрэчу.

Дацэнт кафедры беларускай літаратуры В.І. Смыкоўская: "Ён быў апантаны клопатам аб развіцці мастацкага слова. Заўсёды быў у працы. Пісаў манаграфіі, навуковыя артыкулы, якія адрозніваліся глыбінёй літаратурнага погляду".

Сябар Мікалая Мікалаевіча У.І. Рабянок, дырэктар Рэчыцкага педагагічнага каледжа, расказаў, што каледж "вырас" з вучылішча ў многім дзякуючы навуковай і сяброўскай дапамозе, падтрымцы М.М. Воінава.

Мікалай Мікалаевіч Воінаў быў надзелены вельмі каштоўнымі чалавечымі якасцямі, за якія яго паважалі і любілі людзі.

Загадчык кафедры беларускай літаратуры д.ф.н., прафесар І.Ф. Штэйнер нагадаў, якім надзвычай актыўным, таленавітым арганізатарам быў М.М. Воінаў. У яго была паэтычная душа. Адкрыты, тактоўны, ён любіў людзей і гэта пачуццё было ўзаемнае. Яго смерць стала трагедыяй для многіх.

Надзвычай чуллівымі, пранікнёнымі былі словы загадчыка кафедры беларускай мовы д.ф.н., прафесара А.А. Станкевіч: "Гэта – чалавек глыбокай культуры. У яго была жывая цікаўнасць да людзей. Усе называлі Мікалая Мікалаевіча не іначай, як "наш беларускі прарэктар". Нікому і ніколі не адмаўляў у падтрымцы і дапамозе. Да яго ішлі ўсе. Яго скарб складалі праца, сям'я і кнігі".

Мікалай Мікалаевіч таксама меў паэтычны талент, вельмі цікавы, неардынарны. Старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры В.С. Генаш расказала аб экскурсіі выкладчыкаў універсітэта ў г. Ленінград, у якой прымаў удзел і М.М. Воінаў. Пра гэта падарожжа ён напісаў гумарыстычную паэму "Ехалі мы, ехалі".

У яго памяць у гэты дзень гучала не толькі проза, але і вершы, якія прачытаў выкладчык каледжа імя Л.С. Выгоцкага С.С. Крупенька.

Шмат добрага і карыснага зрабіў за сваё кароткае жыццё Мікалай Мікалаевіч. Не ўсё, на жаль, паспеў з задуманага, але яго справы працягваюць калегі і дзве дачкі. Таццяна Мікалаеўна працуе настаўніцай у адной са школ г. Гомеля, а Алена Мікалаеўна – у ГДУ, на кафедры беларускай мовы. Яна таксама выступала на сустрэчы, расказвала пра бацьку. "І невядома, – сказала Алена Мікалаеўна, – кім ён быў у большай ступені, – бацькам або грамадскім чалавекам".

Працягваецца справа Мікалая Мікалаевіча Воінава ў нашых душах, у нашых сэрцах, у беларускай навуцы.

**М. СЕВЕР'ЯНАВА,**
**студэнтка гр. БЖ-42 філфака.**

Белорусская школа-семинар

# ПО ТЕОРИИ МАССОВОГО ОБСЛУЖИВАНИЯ

С 23 по 25 сентября в нашем университете проводилась Международная научная конференция «Современные математические методы анализа и оптимизации телекоммуникационных сетей», организованная БГУ и ГГУ. Она одновременно являлась 17-й Белорусской школой-семинаром по теории массового обслуживания. Такие школы-семинары как научные конференции по различным приложениям теории массового обслуживания проводятся с 1985г. по инициативе создателя белорусской вероятностной школы профессора Г.А. Медведева (БГУ) и при поддержке ныне покойного академика, бывшего зав. кафедрой теории вероятностей и математической статистики Московского университета, ученого с мировым именем Б.В. Гнеденко. По составу участников до 1994г. они имели характер всесоюзных. Начиная с 1995г., в работе конференций участвуют представители зарубежных стран: Алжира, Германии, Испании, Италии, Нидерландов, Португалии, США, Турции, Франции, Японии.

В работе нынешней конференции приняли участие ученые из Азербайджана, Алжира, Белоруссии, Латвии, Литвы, Молдовы, России, Украины и др.

С пленарными докладами выступили доктора наук И.Н. Коваленко (академик НАН Украины, живой классик теории массового обслуживания), зав. кафедрой матанализа нашего университета Ю.В. Малинковский, А.Н. Дудин и В.И. Клименок (БГУ), В.В. Рыков (Москва), А.А. Назаров (Томск).

Участники и гости конференции обменялись научной информацией по самым различным вопросам, касающимся математических моделей телекоммуникационных сетей, получили мощный импульс для дальнейшей научной работы. Большой вклад в организацию конференции внесли председатель оргкомитета А.Н. Дудин, его члены – Ю.В. Малинковский, О.В. Якубович, аспиранты кафедры математического анализа и студенты, специализирующиеся по теории вероятностей и математической статистике. Большую помощь в организации успешной работы оказали ректор нашего университета профессор М.В. Селькин, соответствующие службы ГГУ.

Прекрасная погода во время проведения конференции благоприятствовала хорошему настроению участников и гостей, которые познакомились с достопримечательностями Гомеля и уникальным музеем в г. Ветке. По их единодушному мнению, организация и проведение конференции были на высоте.

Летнія вандроўкі

# ЗА ВЕДАМІ – У ПОЛЬШЧУ

**Цудоўная магчымасць выдалася чатыром студэнткам філалагічнага факультэта, аўтарам гэтых радкоў: час з 7 па 27 ліпеня г.г. мы правялі ў польскім горадзе Любліне. Паездка была арганізавана "Цэнтрам вывучэння польскай мовы і культуры" пры ўдзеле пасольства Рэспублікі Польшча ў Беларусі.**

Нашай мэтай было ўдасканаліцца ў валоданні польскай мовай, бліжэй пазнаёміцца з мясцовымі традыцыямі, архітэктурай, кінематографам, гісторыяй ды па жаданні ўсталяваць сяброўскія адносіны з насельніцтвам. Можам сказаць, што большасць з пазначаных планаў нам удалося здзейсніць. Ва ўсялякім разе польскі бок зрабіў дзеля гэтага ўсё магчымае: умовы жыцця ў інтэрнаце былі добрыя, аб нас амаль што па-бацькоўску клапаціліся кіраўнік курсаў пан Генрых Соцька і пані Анна, да таго ж кармілі нас шмат і вельмі смачна. Мы ў сваю чаргу абавязкова наведвалі па 3 пары ў дзень, старанна вучыліся, чым даказалі, што лацінская прымаўка "Поўны жывот не займаецца ахвотна" не заўсёды да месца. Мы вучыліся з задавальненнем, тым больш што выкладчыкі былі даволі цікавыя. Яны не толькі прафесійна тлумачылі свае прадметы, але і імкнуліся жартаваць, вучылі нас польскім вершам і песням. Апошнія мы з найвялікшым імпэтам выконвалі не толькі на занятках, але і ў свой вольны час.

Акрамя вучобы арганізатары падрыхтавалі для нас яшчэ шмат чаго цікавага. Скажам, кожную суботу на камфартабельных аўтобусах усіх вазілі на экскурсіі. Вельмі ўразілі нас сваімі палацамі Казлуўна і Баранова. А Казімеж Дольны і старажытны Сандомеж запомніліся сваёй велічнай архітэктурай і прыгажосцю мясцін.

Пасля заняткаў нам прапаноўвалі схадзіць у кінатэатр, на што мы з радасцю згаджаліся. Нам удалося паглядзець такія знакамітыя фільмы, як "Піяніст", "Помста", "Агнём і мячом", "Пан Тадэуш", а таксама "Куды ідзеш?" па Г. Сенкевічу. Героі стужак, безумоўна, размаўлялі папольску, а гэта дало магчымасць не толькі пазнаёміцца з польскім кінематографам, але і засвоіць некаторыя звароты жывой гутаркі.

Па вечарах для слухачоў курсаў былі арганізаваны дадатковыя факультатыўныя заняткі, якія вёў магістр Генрых Соцька. Асаблівую цікавасць у нас выклікаі пары па сучаснай польскай палітыцы ў адносінах да суседзяў і, у першую чаргу, да Беларусі, а таксама аб уваходжанні Польшчы ў Еўрасаюз.

Карацей кажучы, паездка атрымалася пазнавальнай, цікавай і вясёлай. А напрыканцы, крышачку пра нашы ўражанні ад самога Любліна. На другі тыдзень знаёмства з ім мы ўжо ведалі яго як свае пяць пальцаў, чаму паспрыяў бясплатны праезд, забяспечаны арганізатарамі, і не можам не адзначыць, што гэта вельмі і вельмі прыгожы горад. Адно толькі "Старое място" варта не адной фотаплёнкі. А там яшчэ ёсць замак, ратуша, музеі, плошчы, помнікі, магазінчыкі, бары, рэстараны і г.д.

Наша парада другакурснікам філфака: сябры, старанна вучыце польскую мову, каб таксама наведаць Польшчу. Паверце, гэта з усіх бакоў будзе вам вельмі карысна.

**P.S.** Выказваем шчырую падзяку выкладчыку Р.У. Серыкаву, дэканату філфака і супрацоўніцы консульскага аддзела пасольства Рэспублікі Польшча пані Надзеі Дземідзюк.

**Наталля СТАРЧАНКА, Наталля ПАНЦЯЙКОВА, Валянціна ІСАЕНКА, Ірына СОЙКА,**
**студэнткі 3 курса філфака.**

# НА ЗАЩИТЕ ОКРУЖАЮЩЕЙ СРЕДЫ




По инициативе директора НИИ экологии, профессора Г.Г. Гончаренко автором этих строк налажено сотрудничество с Гомельской ассоциацией детей и молодежи (АСДЕМО). Это общественная негосударственная организация, основная цель которой -- воспитание молодых людей как активных членов общества. Ее деятельность направлена на развитие правовой культуры населения и общественного движения в области защиты окружающей среды; пропаганду знаний по вопросам экологического права; презентацию интересов индивидов, инициативных групп, неправительственных организаций по вопросам защиты окружающей среды; проведение образовательных семинаров; поддержку общественных инициатив за мир, демократию и права человека и др.

Членами АСДЕМО стала группа студентов-биологов нашего университета. Е. Исаченко, Д. Жевняк, Е. Каешко, которые специализируются по кафедре зоологии и охраны, являются также экологическими дружинниками.

Одно из направлений деятельности АСДЕМО – экомониторинг питьевой воды и естественных водоемов в г. Гомеле и области. Студентами-гидробиологами кафедры зоологии и охраны природы Д. Жевняком и О. Ткаченко под руководством автора публикации проведены исследования по изучению биоразнообразия двух озер, расположенных в микрорайонах «Волотова» и «Мельников Луг», двух водотоков, подверженных значительному антропическому воздействию, а также водоема-накопителя в районе крупного предприятия города.

С участием АСДЕМО этим летом в г. Гомеле работал Международный экологический лагерь, куда съехались студенты и школьники с разных городов Беларуси, а также из России, Украины, Германии, США. В нескольких мероприятиях, проводимых в рамках его программы, приняла участие группа наших студентов. Они брали гидробиологические пробы на водоемах (с последующей их обработкой) и осуществляли экспресс-анализ по установлению концентрации в воде десяти приоритетных гидрохимических показателей. По результатам анализа давались пояснения относительно качества исследуемой воды.

Мы участвовали и в облагораживании территории возле озера в микрорайоне «Мельников луг».

**И. РАССАШКО,**
**доцент кафедры зоологии и охраны природы.**

## СВОЕВРЕМЕННЫЕ МЫСЛИ

Как это ни горько сознавать, родной язык храним мы так же худо, как свои города и села, реки и озера, леса и луга. Скоропалительно утрачиваем самобытность языка предков, забываем, что слово – зеркало внутреннего мира человека, его духовной красоты и помыслов. Человек смертен, только письмена имеют память. Сохраним же их для грядущих поколений, донесем чистоту и ясность языка. В этом вижу я предназначение памятника славянской письменности.

Каким представляется мне этот главный памятник культуры?

Слово, высеченное в камне на века и тысячелетия, открытая книга, которая позволила бы почувствовать первородную мудрость языка наших предков, книга, где каждое слово – как чистого золота слиток. Это должна быть история славянской (точнее, восточно-славянской) письменности, олицетворение могучего древа, породившего из глубины единого корня великорусский, белорусский, украинский языки, языки одной матери, одной судьбы. Авторы книги – писатели и поэты, ученые и мыслители, религиозные деятели и просветители от Кирилла и Мефодия до летописца Нестора и безвестного автора «Слова о полку Игореве», от берестяных грамот господина Великого Новгорода до Ломоносова, от Пушкина до наших современников. Достойных имен много: Сергей Радонежский и протопоп Аввакум, Николай Гуссовский и Янка Купала, первопечатники Иван Федоров и Франциск Скорина, Тарас Шевченко и Леся Украинка, Лев Толстой и Максим Горький... Выбор велик и весьма труден, как велика и полноводна речь людская.

Памятник славянской письменности стал бы одним из драгоценнейших произведений монументального искусства любого города, будь то древний Киев на Украине или древний Полоцк в Беларуси, Новгород Великий или Великий Устюг, Москва или Санкт-Петербург. Одновременно памятник был бы и укором всем тем, кто находится в плену серых слов, равнодушен к родной речи. С экрана телевизоров прожужжали все уши ноу-хау и шоу, импичменты и бестселлеры, клипы и кайфы, позитивы и альтернативы... Добрый, сердечный, искренний, милый, хороший – какое богатство слов для выражения оттенков взаимоотношений людей друг с другом. Тоску наводит одна лишь мысль, что через два-три года вместо них останется один «позитив». Теряя каждое доброе слово, мы не только обедняем свою речь, но и, хотим этого или нет, приоткрываем дверь для проникновения скверны в души человеческие.

**В.ВАХРУШЕВ,**
**профессор кафедры геологии и разведки полезных ископаемых.**

Гордимся нашими выпускниками

## ЛАУРЕАТ ПРЕМИИ «ЛУЧШИЕ ПЕРЬЯ РОССИИ»

Творческая жизнь Г.Н. Андреевца, выпускника историко-филологического факультета ГГУ 1972 г., начиналась на Ветковщине, в редакции районной газеты «Перамога Кастрычніка». Потом была работа в других периодических изданиях Гомельщины. А теперь он – редактор регионального литературно-исторического и общественно-культурного журнала «Палессе».

Григорий Николаевич собрал большой фактический и интересный материал о белорусах, которые живут в России, и стали известными учеными, писателями, промышленниками. Написанные о них очерки вошли в изданную книгу «Белорусы в России». В ней рассказывается также о деятельности белорусских землячеств и национально-культурных автономий. Этот кропотливый труд Г.Н. Андреевца оценен по заслугам: он стал лауреатом престижной общественной премии профессионального признания «Лучшие перья России», учредителем которой являются ассоциация «Российская пресса», Международная ассоциация журналистов России, Российский Союз профессиональных литераторов и профессиональный Союз работников телевидения России.

Г.Н. Андреевец – первый из белорусских журналистов удостоен этой престижной награды. Ему вручены золотой нагрудный знак, диплом и денежная премия.

Поздравляем!

Слова пра юбіляра

## ГАЛОЎНАЕ Ў ЖЫЦЦІ – МЭТА

Пісаць пра вядомых паэтаў заўсёды нялёгка. Асабліва тады, калі ты добра ведаеш чалавека, з якім даводзілася часцяком сустракацца.

Дарэчы, Эму Васільеўну Усціновіч ведаюць многія гамяльчане. І як тут не ўспомніць, што паэтэса нарадзілася на Гомельшчыне, а ранняе дзяцінства і юнацтва прайшлі ў Добрушы. Яна завочна закончыла філалагічны факультэт Гомельскага педінстытута імя В.П. Чкалава (цяпер – ГДУ імя Ф. Скарыны). Працавала ў камсамольскіх арганізацыях, у Гомельскім Палацы піянераў, настаўнічала. Апошняе месца працы – музычнае вучылішча імя Н.Ф. Сакалоўскага.

Нягледзячы на вечную занятасць, Эма Васільеўна знаходзіла вольную хвілінку для вершаў, якія, быццам птушачкі, выляталі на чысты аркуш. Яе творы сабраны ў паэтычных зборніках "Берега" (1988 г.), "Мелодии души" (1993 г.), "Рассыпанное ожерелье" (1998 г.), "Рябиновая гроздь" (2001 г.), "Эхо" (2002 г.).

"Я вельмі люблю блукаць у лесе, дзе добра арыентуюся, – прызнаецца паэтэса. – У дзяцінстве бегала ў добрушскі лес па ягады і грыбы, цікавілася таямніцамі прыроды, любавалася прыгажосцю роднай зямлі. Мабыць, усё тое светлае і радаснае, занатаванае ў памяці, потым адлюстравалася, як у люстэрку, у маіх вершах..."

Гэтая акалічнасць дапамагае ёй пазнаёміць сваіх чытачоў з творчасцю многіх паэтаў-замежнікаў, мясцовых літаратараў. Пераклады ў Э.В. Усціновіч атрымліваюцца ўдалымі, яны яскрава напамінаюць: перад вамі – вопытная паэтэса, сапраўдны самабытны талент.

У шуфлядцы рабочага стала Эмы Васільеўны назбіралася шмат выдатных вершаў і санетаў, ёсць і проза. Будзем спадзявацца, што ў хуткім часе яны пабачаць свет, знойдуць сваіх прыхільнікаў. Галоўнае, каб ніколі ў яе не перасыхала крыніца паэтычнага натхнення, не знікала жаданне адчыняць акно ў таямнічы свет прыгажосці і радаваць чытачоў новымі выданнямі.

**Г. АТРОШЧАНКА.**

## ПОЛОЖЕНИЕ

### О ПРОВЕДЕНИИ ОБЩЕУНИВЕРСИТЕТСКОГО КОНКУРСА «А НУ-КА, ПЕРВОКУРСНИК!»

Каждый год в университете проводятся конкурсы художественной самодеятельности. В этом году общеуниверситетский конкурс проводится в 2 дня. Они определены художественным советом:

**25 октября:**
исторический факультет
математический факультет
экономический факультет
биологический факультет
факультет психологии
геолого-географический факультет

**26 октября**
юридический факультет
факультет иностранных языков
физический факультет
факультет физической культуры
филологический факультет.

В конкурсе принимают участие студенты ТОЛЬКО 1-го курса. Допускается аккомпанемент со стороны, а также участие не первокурсников в парных выступлениях для целостности и художественного уровня номера.

Продолжительность выступления каждого коллектива – не более 35 минут (из них – 5 минут контрольных).

Конкурсные программы должны быть сданы 21, 22, 23 октября на сцене актового зала. 23 октября необходимо представить отпечатанные программы в количестве 10 экземпляров.

В этом году коллективы готовят свои программы по обязательной теме **«Это новая программа нашего телеканала»**. Непосредственно выбор жанра, в котором готовятся программы, самостоятельный. Программа должна быть интересной и содержательной. Жюри оценивает раскрытие темы, целостность и разножанровость программы, а также актерское и исполнительское мастерство. Вся программа оценивается по 10-ти бальной системе.

Подведение итогов конкурса и награждение призами с вручением переходного приза победителю этого года состоится после окончания второго конкурсного дня.

Программы оценивает альтернативное жюри в составе 7 человек. Это представители ректората, студенческого клуба ГГУ и приглашенные специалисты по различным жанрам.

Положение о конкурсе принято на художественном совете студенческого клуба им. Ф. Скорины 5 сентября 2003 года.

Оргкомитет приглашает всех на традиционный конкурс «А ну-ка, первокурсник-2003». Билеты можно приобрести **на факультетах у культоргов**. Справки по телефону: 57-33-30.

**СТУДЕНЧЕСКИЙ КЛУБ.**

## ТРУДОВОЕ ЛЕТО... НА КУРОРТЕ

Прошедшее лето некоторые студенты ГГУ провели в городе-курорте Анапа. Но наслаждаться беззаботно и вволю всеми прелестями отдыха у Черного моря им не довелось. Работа воспитателями и вожатыми в детской здравнице – дело серьезное, хлопотное, и они понимали всю ответственность, которая на них была возложена. А отсюда – результат их работы с чуткими детскими душами. Это подтверждает письмо, пришедшее в университет на имя ректора М.В. Селькина следующего содержания:

*«Администрация санатория благодарит Вас за хорошую трудовую подготовку студентов, работавших курортный сезон в нашей здравнице. За время работы студенты проявили себя творческими, инициативными личностями, ответственно относились к любому порученному делу, дисциплинированны, четко соблюдали внутренний распорядок санатория. В коллективе пользовались заслуженным авторитетом.*

*В связи с этим у нас возникло желание возобновить трудовые отношения с Вашим университетом в 2004 году.*

**С уважением Генеральный директор Б.Н. РОГОЗЯН.»**



Лето бросило якорь — клены роняют листья.

Фотоэтюд В.П.Чистика.

## ВАШ ДОСУГ

**СМОТРИТЕ В КИНОТЕАТРЕ «ЮБИЛЕЙНЫЙ»:**

**8 – 12 октября:** (Премьера) фантастика/боевик **«Пуленепробиваемый»** (США). Начало – 18.00. Цена билета: 2000 руб.

Эротический триллер **«Тень женщины»** (США). Начало – 20.00. Цена билета: 1000 руб.

**15 – 19 октября:** фантастический супербоевик **«Терминатор-3: восстание машин»** (Великобритания, США, Германия, Япония). Начало – 18.00. Цена билета: 1000 руб.

Криминальная мелодрама **«Стриптиз»** (США). Начало – 20.00. Цена билета: 1500 руб.

**22 – 26 октября:** семейная мелодрама **«Бальное платье»** (Беларусь). Начало – 18.00.

Эротический триллер **«Другой мужчина»** (США). Начало – 20.00.

Цена билетов: 1000 руб.

**29 октября – 2 ноября:** (Премьера) приключения/фантастика **«Лара Крофт – расхитительница гробниц: колыбель жизни»**. Начало – 18.00. Цена билета: 2000 руб.

Молодежная комедия **«Король вечеринок»**. Начало – 20.00. Цена билета: 1000 руб.

**Киносеансы для детей:**

**11 – 12 октября:** сказка **«Карлик Нос»** (Россия). Начало – 14.00.

**18 – 19 октября:** сказка **«Повелитель луж»** (Россия). Начало – 14.00.

**25 – 26 октября:** приключения/комедия/семейный фильм **«Бетховен-2»** (США). Начало – 14.00.

Цена билета: для детей – 300 руб.; для взрослых – 600 руб.

**Автоответчик: 57-56-69.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

– крымінальнага права і працэсу – асістэнта;
– оптыкі – прафесара;
– тэарэтычнай фізікі – дацэнта (2), асістэнта;
– батанікі і фізіялогіі раслін – асістэнта;
– аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры – выкладчыка;
– радыёфізікі і электронікі – асістэнта (2).

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14.
Тэл. 56-30-71.
E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4443.
Падпісана да друку 07.10.2003 г.